Фотарэпартаж Відэа

Лучайская парафія Святога Юды Тадэвуша, Апостала, 23 жніўня адсвяткавала апошні летні фэст з нагоды свята ведаў. Вернікі прыйшлі ў лучайскую святыню, каб памаліцца за вучняў, студэнтаў, настаўнікаў, выхавацеляў, а таксама каб у перадапошнюю нядзелю канікул атрымаць благаслаўленне на новы навучальны год.



Распачалося набажэнства адарацыяй Найсвяцейшага Сакраманту. Разважанні на тэму Эўхарыстыі былі выбраны невыпадкова , бо падчас ўрачыстасці
да гэтага сакраманту
ў
першыню прыступілі трое дзяцей з парафіі.

Лучайскія набажэнствы адрозніваюцца характэрнымі рысамі: падчас урачыстасцяў заўсёды падбіраюцца тэматычныя разважанні, якія дапамагаюць вернікам якасна падрыхтаваць свае сэрцы да святой Імшы.

Навучэнец семінарыі Алег Зямчонак прачытаў словы з прамовы Папы Францішка: «Эўхарыстыя — гэта сам Езус, які цалкам дорыць нам сябе. Насычэнне Ім і прабыванне ў Ім праз Эўхарыстычную Камунію, калі робім гэта з верай, перамяняе наша жыццё ў дар Богу і братам».

Святая Імша пачалася ўрачыстай працэсіяй святара з міністрантамі і дзецьмі, якія прыступалі ў гэты дзень да Першай святой Камуніі.

Дары, якія былі прынесены ў гэты дзень да алтара, былі вельмі разнастайнымі. Пачынаючы час збору ўраджаю, вернікі пажадалі падзякаваць Богу за сёлетнія дары прыроды. Сярод прынесеных дароў былі кветкі, снапы збожжа, плады новага ўраджаю, мёд, заплечнік і шмат іншага.





Гурт "Вес

